наследием равноапостольных учителей и просветителей славян. И если мы будем помнить об этом и жить с постоянной мыслью о громадной ответственности за духовное состояние мира, которую несут христиане всех времен и народов, тогда о славянах с полным основанием скажут, как говорят об их боговдохновенных учителях: “Стезя праведных — как светило лучезарное, которое более и более светлеет до полного дня” (Притч. 4: 18).

Славянские народы родственны по крови, едины по вере и неразделимы по судьбе на крестном пути своего исторического бытия. И, что не менее важно, у нас общие учители и просветители, святые равноапостольные Мефодий и Кирилл, которые открыли перед славянами Евангелие – источник жизни вечной — и возгласили истины Господни на том языке, который сквозь толщу одиннадцати с лишним столетий звучит в православных храмах по всей земле, благовествуя верным спасение.

Позвольте мне вновь приветствовать всех участников настоящих Чтений и призвать Божие благословение на их успешное проведение!

**М.А.Бяспалая,**
*прафесар*

## ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

(да 900-гадовага юбілею асветніцы)

Узнікненню кожнай гістарычнай з’явы папярэднічаюць пэўныя палітыка-эканамічныя і сацыяльна-культурныя ўмовы. Духоўнае жыццё Полацкай зямлі фарміравалася пад уплывам, з аднаго боку, асветніцкіх ідэй салунскіх братоў Кірылы і Мяфодзія, з другога — традыцыйных вераванняў, уяўленняў, поглядаў тагачаснага насельніцтва. Палітычнае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і эканамічнае станаўленне Полацкага княства суправаджалася глыбокімі працэсамі ў духоўным жыцці. Галоўная роля ў гэтым належала хрышчэнню ўсходніх славян, прыходу разам з хрысціянствам пісьменнасці і пашырэнню гэтых узаемазвязаных і ўзаемазалежных з'яў на шырокія колы грамадства. Менавіта паглыбленне ведаў садзейнічала далучэнню да хрысціянскай веры, да разумення яе глыбіннай сутнасці, да жадання займацца асветніцкай дзейнасцю.

З хрысціянствам і пісьменнасцю ў Беларусь прыйшла і літаратура: "ізборнікі" з афарызмамі і выслоўямі, перакладзены з грэчаскай мовы раман "Александрыя" аб подзвігах А.Македонскага, вострасюжэтная "Аповесць пра Акіра Прамудрага", "Шасцідзённік", "Філіялог", "Хроніка Георгія Мартола" і інш. Як лічаць даследчыкі, маглі трапляць у старажытнабеларускія княствы і працы антычных філосафаў Арыстоцеля, Платона, творы візантыйскіх вучоных. Нельга адмаўляць магчымасці распаўсюджання на нашых землях спісаў "Аповесці мінулых гадоў". Да знаёмства з гэтымі творамі далучаліся шырокія колы грамадства, што ў сваю чаргу выклікала з'яўленне неардынарных ідэй і ўчынкаў. Фарміраваўся светапогляд, які грунтаваўся на хрысціянскіх прынцыпах, але не без уплыву мясцовага фактару. Не выпадкова ў XII ст. з'явіліся такія велічныя асобы падзвіжнікаў-асветнікаў, як Кірыла Тураўскі, Клімецій Смаляціч і Ефрасіння Полацкая.

Аб жыцці і падзвіжніцтве Ефрасінні Полацкай існуе багатая бібліяграфія. Яна ўключае выданні і перавыданні адзінай дакументальнай крыніцы аб яе дзейнасці — "Жыція Прападобнай Ефрасініі", навуковыя даследаванні, мастацкія творы [6]. Са старонак "Жыція…", літаратуры, прысвечанай асветніцы, паўстае вобраз неадназначнай асобы — адукаванай, рашучай, настойлівай і смелай, вялікай патрыёткі свайго краю. Менавіта яго росквіту, дабрабыту Ефрасіння Полацкая прысвяціла сваё жыццё. Уражвае разуменне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маладой дзяўчынай свайго прызвання. Хаця, як вядома, "Жыціе..." было напісна пазней, аднак яго аўтар уклаў у вусны князёўны Прадславы словы, якія павінны былі быць сказанымі, каб пераканаць і цётку-ігуменню, і бацькоў. Нагадаем гэтыя словы: "Усё відавочнае на гэтым свеце прыгожае і слаўнае, але хутка мінае, як сон, або вяне, бы квет; вечнае ж і невідавочнае ў вяках жыве, як гаворыць Пісанне..." [1]. Гэтыя словы адлюстроўваюць прадуманасць Прадславай свайго ўчынку, адданасць яе ідэі служэння Богу. Можна меркаваць нават, што князёўна ведала "Аповесць мінулых гадоў" і думку, выказаную аўтарам і прысвечаную знакамітаму дзеду Прадславы полацкаму князю Усяславу Чарадзею: "Ні быстраму, ні хітраму, ні шпаркаму птаху не мінаваці Божага суда!"

Далейшае жыццё (пасля пострыгу) дэманструе яе глыбокія пачуцці і перакананні ў неабходнасці далучэння да ахвяравання Богу як мага большага кола людзей і неабходнасці самаахвярнага падзвіжніцтва. Нагадаем, што маладая манахіня пасялілася ў Сафійскім саборы ў келлі-галубніцы і "нача книгы писати своими руками" [1]. Можна лічыць гэты ўчынак свайго роду духоўным аскетызмам, што блізка "слупніцтву" Кірылы Тураўскага.

Дзейнасць Ефрасінні сведчыць аб засваенні ёю культуры хрысціянскага свету і актыўным удзеле ў яе пашырэнні. Як і ва ўсёй хрысціянскай Еўропе XII ст., у Полацкім княстве асяродкам пісьменнасці і асветы з'яўляліся манастыры. Пры іх знаходзіліся школы, дзе дзеці вучыліся пісьму, "цыфры", царкоўным спевам і нотнай грамаце. Некаторыя даследчыкі лічаць, што "вывучаць грамату было адным з абавязкаў інакінь". У "Жыціі..." апавядаецца пра адкрыццё бібліятэк са скрыпторыямі, дзе перапісваліся кнігі, і тым самым пашыралася пісьменнасць. Да асветы далучалася шырокае кола палачан, чаго вымагалі палітычныя і сацыяльна-эканамічныя абставіны Полацка. Вядомы факт аб стварэнні школы ў Полацкай зямлі і яго трактоўка навукоўцамі як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якасна новага этапу ў “адукацыйнай дзейнасці на Русі” [3]. Да асветніцкай дзейнасці Ефрасінні Полацкай адносіцца і адкрыццё іканапіснай і ювелірнай майстэрань, дзе таксама адбываўся працэс навучання.

Дзякуючы асветніцкай дзейнасці Ефрасіння Полацкая набыла вялікі аўтарытэт. Гэтаму садзейнічалі і яе высокае паходжанне, воля, разумнасць. Даследчыкамі выказваецца думка, што ігуменння актыўна ўдзельнічала ў палітычным жыцці Полацка. Праз полацкае веча яна ўплывала не толькі на запрашэнне ў Полацк князёў, але і на прызначэнне епіскапаў, бо веча павінна было ўхваліць прапанаваную кіеўскім мітрапалітам кандыдатуру. Як піша С.Гаранін, «...менавіта княжацкае паходжанне дазваляла ... манахіні праводзіць самастойную лінію дзейнасці, прычым уяўленне аб сваёй выключнасці ўваходзіла ў сістэму светапогляду Ефрасінні: яна адчувала сябе “князёўнай царквы”, не проста ігуменняй Спаскага манастыра, а ўсёй Полацкай зямлі» [4].

Многім з жыхароў Беларусі і нашых суайчыннікаў за яе межамі вядома праблема, звязаная з крыжам святой Ефрасінні, сляды якога згубіліся ў гады другой сусветнай вайны. Нагадаем некалькі радкоў з аповесці У.Арлова: «З канца дваццатых гадоў не забяспечаная дэмакратызацыяй грамадства палітыка адраджэння нацыянальнай культуры, вядомая пад назвай “беларусізацыя”, пачала па камандзе з Масквы хутка згортвацца. Пасля публікацыі ў 1928 г. разгромнага артыкула сакратара ЦК (б) Беларусі Вільгельма Кнорына “Аб рашаючых “дробязях” у вялікім пытанні” пачынаецца падрыхтоўка да расправы з нацыянальнай інтэлігенцыяй... У той трывожны час былы прэм’ер БНР, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі выязджае з адмысловаю экспедыцыяй у Полацк. Мэта — пошукі неацэннага твора Лазара Богшы. Крыж Ефрасінні знайшоўся ў мясцовым фінаддзеле і быў перавезены ў Мінск» [2].

Аднак, здаецца, з’явілася мажлівасць дапоўніць гэтыя звесткі. Выпадкова ў пратаколе пасяджэння калегіі Народнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

камісарыята асветы ад 17 студзеня 1927 г. чытаем абвестку дня і бачым, што абмяркоўвалася пытанне “Аб перадачы Беларускаму дзяржаўнаму музею з Аршанскага музея былога Куцеінскага кляштара, з Полацкага Сафійскага сабора карціны “Забойства Сцяпана” і з Полацкага акрвыканкама — крыжа Ефрасінні Полацкай”. Пытанне пастаўлена заблытана, але, мабыць, гэта віна хутчэй сакратара. Тым не менш сэнс зразумелы.

На пасяджэнні прысутнічалі наркам асветы Баліцкі, старшыня Галоўпалітасветы Шамардзіна, Валасевіч, Абрамчук, Гільдбрайхт, Мельнік, Мазур, Папова, Мац, Аболіна, Ведрынайціс, Рывес, Башкевіч, Таўбэ, Галкін. Відаць, Вацлава Ластоўскага на пасяджэнне не запрасілі.

Звестак аб абмеркаванні пытання ў пратаколе няма, а можа яно і не абмяркоўвалася, а адразу прынялі пастанову: “Калегія НКА лічыць неабходным узняць пытанне перад СНК Беларусі аб перадачы памянёных рэчаў Беларускаму дзяржаўнаму музею”.

Такім чынам, трэба прызнаць, што месцазнаходжанне крыжа святой Ефрасінні было вядома, што праблема перадачы яго абмяркоўвалася на самым высокім узроўні і, мабыць, В.Ластоўскі перавёз крыж у Мінск у 1927 г., а не пазней.

Вось такое маленькае дапаўненне да фактаў, якія ўжо сталі хрэстаматыйнымі. Безумоўна, было б лепш, каб знайшліся архіўныя звесткі аб сённяшнім месцазнаходжанні крыжа, але будзем спадзявацца, што камусьці пашанцуе і наша святыня вернецца на Радзіму.

Духоўнае падзвіжніцтва Кірылы і Мяфодзія выклікала да жыцця цэлую плеяду славянскіх падзвіжнікаў, сярод якіх, “яко луча сонечная”, ззяе асоба Ефрасінні Полацкай. Яе асветніцкая дзейнасць, любоў да Радзімы, служэнне ёй з’яўляюцца прыкладам для беларусаў ужо 900 гадоў. І хаця мы жывём у секулярным свеце, аднак пошукі маральных арыенціраў працягваюцца, і падмуркам для іх застаецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўнае падзвіжніцтва Кірылы і Мяфодзія, Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны і іншых, таму што яны клапаціліся пра выхаванне душы і духоўнасці і разумелі "хваляванні людскога сэрца".

---


1. *Аповесць* жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Ефрасінні... // Беларуская мінуўшчына. — 1994. — № 3. — С. 50.

2. *Арлоў У.* Ефрасіння Полацкая. — Мн.: Мастацкая літаратура, 1992. — С. 15—16, 49.

3. *Варатнікова А.А.* Гістарыяграфічныя звесткі пра Ефрасінню (Прадславу) Полацкую // Помнікі культуры: новыя адкрыцці. — Мн.: Навука і тэхніка, 1985. — С. 141.

4. *Чаранін С.* Дзейнасць Ефрасінні Полацкай і ўзаемаадносіны асветніцы з царкоўнымі ўладамі // 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў. — Мн.: Беларуская навука, 1998. — С. 162.

5. *Дзяржаўны* архіў Мінскай вобласці, фонд 320, воп. 1., спр. 215, л. 43.

6. *Порецкий А.А.* Кірыла-Мяфодзіеўскія традыцыі ў духоўнай і кніжнай культуры славянскіх народаў // Матэрыялы IV Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў / Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. — Ч. 2. — С. 56—62.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.П.Пракапцова,**
*прафесар*

## ДЫЯЛЕКТЫЧНАЕ АДЗІНСТВА СІНКРЭТЫЧНАСЦІ І СЕКУЛЯРНАСЦІ Ў ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ ТВОРЧАЙ АСОБЫ

Спроба вызначыць ролю творчай індывідуальнасці – як педагога, так і вучня – у развіцці мастацкай культуры і